

МІКІТА КОЧУР

Дата нараджэння: 16 ліпеня

Дата затрымання: 20 лістапада 2020

Прад'яўленыя абвінавачванні:
арт. 363 Крымінальнага кодэкса — Супраціў супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якая ахоўвае грамадскі парадак

Вынік суда: 4 гады

Від пакарання: пазбаўленне волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму

Суддзя: Касцюкевіч Анжэла

Пракурор: Дзіндзілевіч Вольга

Месца зняволення: ПК № 22

Заява аб прызнанні палітвязнем

Мікіта Міхайлавіч Кочур — інжынер з Мінска. Быў асуджаны па **ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэксу** (Супраціў міліцыі з выкарыстаннем гвалту) на 4 гады пазбаўлення волі.

Увечары 11 жніўня 2020 года, калі ў Мінску праходзілі акцыі пратэсту супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, Мікіта Кочур сустрэўся з братам і ягонай жонкай на вуліцы Някрасава, каб паказаць нядаўна набыты матацыкл. Да іх пад'ехала міліцыя,

Падтрымаць «Вясну»

прадставіцца і паказаць службовыя пасведчанні. У выніку Мікіту сцягнулі з матацыкла, павалілі на зямлю, збілі дубінкамі і затым павезлі ў РУУС.

Пазней на Мікіту Кочура завялі крымінальную справу па ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэкса (Супраціў супрацоўнікам міліцыі пры выкананні, спалучанае з прымяненнем гвалту). 20 лістапада 2020 года яго ўзялі пад варту. Пацярпелымі па крымінальнай справе былі прызнаныя начальнік УУС Савецкага раёна **Сяргей Каліннік**, старшы інспектар ДАІ Савецкага раёна **Яўген Крыварот**, супрацоўнікі міліцыі **Невяровіч і Надзёжны**.

Згодна з прад'яўленым абвінавачаннем, па патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі Кочур адмовіўся прад'явіць дакументы і падаць да агляду транспартны сродак (матацыкл «Хонда»), таксама адмовіўся прайсці ў Савецкае РУУС для высвятлення асобы. Замест гэтага ён аказаў супраціў супрацоўнікам міліцыі - штурхаў і наносіў удары, парваў аднаму з іх кашулю. А палкоўнік Сяргей Каліннік ўпаў ад штуршка Качура і атрымаў траўму локця. Але ніхто з іншых пацярпелых не бачыў, каб Кочур наносіў Калінніку нейкія ўдары. Мікіта Кочур сваёй віны ў злачынстве не прызнаў.

19 сакавіка 2021 года ў судзе Заводскага раёна Мінска абвясцілі прысуд Кочуру: **4 гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму.**



Менчука асудзілі на 4 гады калоніі за супраціў пры затрыманні. Суд вырашыў, што ён траўмаваў начальніка Савецкага РУУС

У судзе Заводскага раёна Мінска 19 сакавіка абвясцілі прысуд 23-гадоваму інжынеру Мікіту Кочуру, абвінавачанаму па ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэкса (Супраціў супрацоўніку міліцыі пры выкананні, спалучанае з прымяненнем гвалту). Суддзя Анжэла Касцюкевіч прызнала Кочура вінаватым і прысудзіла яму 4 гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму. Напярэдадні пракурор Вольга Дзіндзілевіч запрасіла для яго менавіта такое пакаранне. "Вясна" з дапамогай валанцёраў вяла маніторынг гэтага судовага працэсу, расказваем яго падрабязнасці.

Адрас для лістоў: ПК № 22. 225295, Брэсцкая вобласць, г. Івацэвічы, ст. Даманава, а/с 20

Даслаць паштоўку



Іншыя палітвязні



Алег Гаўрылаў

Дата затрымання: 13 снежня 2021



Віктар Шаура

Дата затрымання: 10 жніўня 2020

Дзмітрый Адарачкін

Дата затрымання: 15 кастрычніка 2021

Падтрымаць «Вясну»



Дзяніс Барсукоў

Дата затрымання: 19 красавіка 2022

Палітвязні знаходзяцца па адрасах:



СІЗА-1

220030, г. Мінск, вул. Валадарскага, 2

123 палітзняволеных

СІЗА-7

224030, г. Брэст, вул. Савецкіх памежнікаў, 37

16 палітзняволеных

Следчая турма № 8

222163, г. Жодзіна, вул. Савецкая, 22А

32 палітзняволеных

СІЗА-6

225413, г. Баранавічы, вул. Брэсцкая, 258 В

13 палітзняволеных

Паказаць больш

Апошнія навіны

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады

Падтрымаць «Вясну»

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

26.04.2023

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

26.04.2023

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

25.04.2023

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

21.04.2023

Больш навінаў

Што варта ведаць і як дапамагчы?

✉️ Практычны дапаможнік па перадачах для вязняў ад “Вясны”

✉️ Як зрабіць грашовы пераход зняволенаму?

✉️ Наша сіла — ў салідарнасці! Вялікі дайджэст па дапамозе палітвязням

✉️ Напішы ліст і адпраў паштоўку. Пра што і як пісаць?

✉️ Як даслаць пасылку вязню і чаму гэта важна?

❤️ Далучайся да ініцыятывы «Вызваленне-2020» (для родных палітвязняў)

🗣️ Што чакае асуджаных па палітычных справах пасля абвяшчэння прысуду?

ВЯСНА праваабарончы цэнтр

viasna@spring96.org

Падтрымаць «Вясну»